# [Аб дачыненьнях паміж „я“ і творам]

Мастацкі твор — не такая простая рэч, як гэта дзе каму выдаецца на першы погляд. На самай–жа рэчы, твор поэзіі — просты ў сваёй складанасьці і складаны ў сваёй прастаце. Твор поэзіі — гэта своеасаблівая соцыяльная зьява, і як такая яна вымагае адпаведнага да сябе падыходу. Сапраўды, мастацкі твор, калі ён сапраўды мастацкі, — рэч надзвычай разнастайная і разнабаковая. Разнастайнасьць яе выяўляецца зазвычай у дачыненьні да іншых зьяў быцьця. У дачыненьні пахаджэньня мастацкі твор ёсьць „вынік дум і творчага гарэньня“, кажучы словамі Дуб[оўкі]. І наадварот, у дачыненьні яго жыцьця ў грамадзе ён — пачатак дум і суджэньняў. Так вынік (для поэты) становіцца пачаткам (для чытача). Потым ён робіцца і асноваю (суджэньняў), і аргумэнтам; ён і сродак, і мэта, ён вырашэньне і выяўленьне, ён і ўяўленьне, і ўтайненьне. Словам, твор — не такая ўжо простая рэч, як дзе каму хацелася–б яе такою бачыць, асабліва з тых, хто ня любіць мысьліць. Поэзія — гэта мысьленьне, і як такая яна патрабуе мысьлі для свайго разуменьня. А што значыць зразумець твор? Гэта значыць пазнаць яго ў яго дачыненьні да іншых зьяў.

Аднэй з такіх іншых зьяў у адносінах да твору ёсьць і „я“. Адгэтуль маё разуменьне твору ёсьць нішто іншае, як выражэньне дачыненьня: твор і „я“. Твор — зьява, і „я“ — таксама зьява (калі зьява, то зьява нечага). Якія–ж дачыненьні магчымы між гэтымі дзьвюма зьявамі? Я чытаю твор — адно дачыненьне, я мысьлю твор — другое, я суджу твор — трэцяе, я прымаю, я адмаўляю і г. д. Словам, дачыненьне можа быць самае разнастайнае. Характарам дачыненьня да твору вызначаецца і характар разуменьня твору. Прычым у дачыненьнях між „я“ і творам магчымы такія палажэньні: або „я“ шырэйшае за твор і таму, яго асвоіўшы, убірае яго ў сябе, робіць яго сваім зьместам, зьнімае яго сабою, або, наадварот, „я“ вузкае і таму само распускаецца ў творы і ў ім зьнімаецца, яму падпарадкуецца, нарэшце, можа быць і такое палажэньне, калі і я, і твор зьнімаюцца ў трэцім, скажам, у літаратурным паняцьці.

*[1930]*